Наименование ТВП: Выдрица

© С. Левый

Код: BY044

Географические координаты: 52° 44' N 29° 40' E

Административная принадлежность: Гомельская область: Жлобинский район, Светлогорский район

Площадь: 22906 га

Критерии: A1

Национальный природоохранный статус: большая частка тэррыторыі Рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Выдрыца» (17650 га)

Международный природоохранный статус: ТВП міжнароднай значнасці

Общее описание:

ТВП уключае ў сябе буйны леса-балотны масіў у поймах рэк Ола і Бярэзіна. Па форме рэльефу тэрыторыя ўяўляе сабой паката-хвалістую раўніну з густой сеткай лагчын стоку талых ледніковых вод, скразнымі далінамі і згладжанымі марэннымі павышэннямі.

Асноўнымі вадатокамі ўгоддзя з’яўляюцца рэкі Бярэзіна і яе левыя прытокі – Ола і Выдрыца. Даліна Бярэзіны на тэрыторыі заказніка шырынёй 2-8 км, пойма забалочаная, большай часткай левабярэжная (шырынёй 1,5-5 км), утворана

пясчана-глеістымі і тарфяна-глеістымі глебамі, зарослая хмызнякамі і часткова лесам. У веснавую паводку і пры асенніх дажджах затапляецца на тэрмін да 1,5 месяца з вышынёй узроўню вады 0,2-3,5 м. У пойме Бярэзіны ў межах праектуемай ТВП ёсць каля 30 старычных азёр плошчай ад 0,001 да 0,2 км^2.

У паніжэннях рэльефу і ў поймах рэк размешчаны 23 балотныя масівы, у асноўным нізіннага тыпу. Іх агульная плошча складае каля 6500 га. Самыя буйныя з іх Макушкі, Уюноў, Гачава, Сакаловічы, Доўгі, Антонаўскае і Дзедна.

Аснову расліннасці ўгоддзя складаюць забалочаныя лясы і парослыя сасняком балоты. Тут сустракаюцца фрагменты шырокалісцёвых лясоў, у складзе якіх прысутнічаюць дуб, ясень ліпа, граб і клён. У шэрагу з імі па сухадолах растуць сухадольны лясы з сасны, елкі, ясеня і дуба з багатым падлескам і наглебавым покрывам, у складзе якога сустракаецца шмат рэдкіх і знікаючых відаў раслін.

У межах заказніка “Выдрыца” расце 670 відаў сасудзістых раслін. Сярод іх 5 відаў дзеразы, 6 – хвашчоў, 11 – папаратнікападобных, 3 – голанасенных і 445 відаў пакрытанасенных.

Асноўнай формай выкарыстання тэрыторыі з’яўляецца лесагаспадарчая дзейнасць (83% ад агульнай плошчы). Усе астатнія землі выкарыстоўваюцца ў сельскагаспадарчых мэтах. Сенажаці і выганы размешчаны ў асноўным у пойме Бярэзіны. Урадлівасць сельскагаспадарчых земляў вельмі нізкая, і выкарыстоўваюцца яны малаэфектыўна.

Каля 2,2 тыс. га лясоў заказніка ўваходзіць у склад зялёнай зоны горада Светлагорска, з іх 213 га – у яе лесапаркавую частку. Нягледзячы на тое, што большая частка гэтых лясоў пераўвільготненая, і акрамя таго, забруджаная радыянуклідамі, яны нясуць адчувальную рэкрэацыйную нагрузку. Рака Бярэзіна і шматлікія пойменныя азёры выкарыстоўваюцца мясцовымі жыхарамі для летняга адпачынку і рыбнай лоўлі.

Основные биотопы:

Лясы – 60%, нізінныя балоты – 30,5%, поймавыя заліўныя лугі – 5%, рэкі і іх узбярэжжы – 1,5%, іншыя землі – 3%.

Птицы:

Арніталагічная каштоўнасць тэрыторыі вызначаецца, перш за ўсё,

гнездаваннем глабальна пагражаемых відаў птушак – вялікага арляца *Aquila clanga* і дубальта *Gallinagomedia*. Усяго на тэрыторыі ТВП сустракаецца 146 відаў птушак. З ахоўваемых у Беларусі відаў тут адзначаны вялікі бугай *Botaurus stellaris*, чапля-лазянік *Ixobrychus minutus*, чорны бусел *Ciconia nigra*, скапа *Pandion haliaetus*, сокал-пустальга *Falco tinnunculus*, сокал-шулёнак *Falco vespertinus*, сокал-кабец *Falco subbuteo*, шэры журавель *Grus grus*, звычайны зімародак *Alcedo atthis*, зялёная жаўна *Picus viridis* і садовая стрынатка *Emberiza hortulana*.

Залітая веснавой паводкай пойма Бярэзіны служыць месцам адпачынку і кармёжкі для шматлікіх пралётных гусей і качак.

Другие группы животных:

Спісак млекакормячых утрымлівае 41 від, што складае больш паловы беларускай тэрыафауны. З ахоўваемых у рэспубліцы відаў адзначаны барсук *Meles meles* і арэшнікавая соня *Muscardinusavellanarius*. Тут сустракаюцца таксама дзік *Sus scrofa*, казуля *Capreolus capreolus*, лось *Alces alces*, заяц-бяляк *Lepus timidus*, заяц-русак *Lepus europaeus*, андатра *Ondatra zibethica*, вавёрка звычайная *Sciurus vulgaris*, лісіца звычайная *Vulpes vulpes*, куніца лясная *Martes martes*, тхор лясны *Mustela putorius*, ласка *Mustela nivalis,* гарнастай *Mustela erminea*, норка амерыканская *Mustela vison*, янотападобны сабака *Nyctereutes procyonoides*, выдра *Lutra lutra*.

З 12 відаў земнаводных і 7 відаў паўзуноў, якія сустракаюцца ў Беларусі, ва ўгоддзі адзначана 10 і 6 відаў адпаведна. Адзін від – балотная чарапаха занесены ў Чырвону кнігу Рэспублікі Беларусь.

Состояние редких видов птиц:

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды	Критерий ТВП
Гусь серый *Anser anser*	мг	+	2001	П		
Выпь большая *Botaurus stellaris*	гн	1 с	2006	П		

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды	Критерий ТВП
Выпь малая *Ixobrychus minutus*	гн?	+	2001	П		
Цапля большая белая *Casmerodius albus*	мг	+	2001-2011	П		
Черный аист *Ciconia nigra*	гн	> 4 п	2001	П		
Коршун черный *Milvus migrans*	гн	> 5 п	2001	П		
Змееяд *Circaetus gallicus*	гн	> 4 п	2001	П		
Лунь полевой *Circus cyaneus*	гн	> 1 п	2001	П		
Малый подорлик *Aquila pomarina*	гн	> 3 п	2001	П		
Подорлик большой *Aquila clanga*	гн	2 п	2001	Т		A1
Скопа *Pandion haliaetus*	мг	+	2001	П		
Пустельга обыкновенная *Falco tinnunculus*	гн	+	2001	П		
Чеглок *Falco subbuteo*	гн	> 3 п	2001	П		
Коростель *Crex crex*	гн	+	2001	П		

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды	Критерий ТВП
Журавль серый *Grus grus*	гн	3 п	2001	П		
Кулик-сорока *Haematopus ostralegus*	гн	5-6 п	2001	П		
Галстучник *Charadrius hiaticula*	гн	1-2 п	2001	П		
Дупель *Gallinago media*	гн	30-40 с	2001-2011	Э	↔	A1
Веретенник большой *Limosa limosa*	гн	+	2011	П		
Поручейник *Tringa stagnatilis*	гн?	1 п	2011	П		
Неясыть бородатая *Strix nebulosa*	гн?	> 1 п	2001	П		
Обыкновенный зимородок *Alcedo atthis*	гн	> 8 п	2001	П		
Дятел зеленый *Picus viridis*	гн	+	2001	П		
Дятел белоспинный *Dendrocopos leucotos*	гн	+	2001	П		
Мухоловка-белошейка *Ficedula albicollis*	гн	+	2001	П		

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды	Критерий ТВП
Овсянка садовая *Emberiza hortulana*	гн	+	2001	П		

Другие редкие и находящиеся под угрозой исчезновения виды:

Звяры: барсук*Melesmeles,* арэшнікавая соня*Muscardinusavellanarius.*

Рэптыліі: балотная чарапаха *Emys orbicularis.*

Расліны: баранец звычайны *Huperzia selago*, жаўтазель германскі *Genista germanica*, змеегалоўнік Руйша *Dracocephalum ruyschianum*, зубніца клубняносная *Dentaria bulbifera*, касач сібірскі *Iris sibirica*, увярэднік скіпетрападобны *Pedicularis sceptrum-carolinum*, асака каранішчавая *Carex rhizina*, дзераза заліваемая *Lycopodiella inundata*, сон лугавы *Pulsatilla pratensis*, тайнік яйцападобны *Listera ovata*, фіялка багнавая *Viola uliginosa*, шпажнік чарапіцавы *Gladiolus imbricatus*.

Угрозы:

Асноўнымі формамі антрапагеннай нагрузкі ў заказніку з’яўляюцца высечка лесу, гідрамеліярацыя, пажары, выпас жывёлы і дачнае будаўніцтва.

Высечкі лесу вядуцца ў асноўным у хвойных і шырокалісцёвых лясах, у меншай меры – у бярэзніках і алешніках. Пасля стварэння заказніка і пераводу лясоў у першую групу высечкі былі абмежаваны, аднак захоўваецца пагроза высечкі старых шырокалісцёвых лясоў на астравах, якія маюць вялікае значэнне для падтрымкі біялагічнай разнастайнасці рэгіёну.

Гідрамеліярацыяй былі закрануты толькі паўднёва-заходняя і паўночна-усходняя часткі заказніка, таму негатыўнае ўздзеянне асушальнай сеткі носіць лакальны характар. Каналізацыя асноўнага вадатока ўгоддзя – ракі Олы прывяла да павышэння ўзроўню веснавых паводак, з аднаго боку, і да ўзмацнення ўздзеяння летніх засух, з дугога.

Фактар турботы. У межах ТВП знаходзяцца дачныя таварыствы, што з’яўляецца дадатковым істотным фактарам турботы жывёл, асабліва ў час размнажэння. Пасля стварэння тут заказніка далейшае пашырэнне дачнай забудовы было

забаронена.

Рекомендации по сохранению:

Для захавання жывёльных і раслінных комплексаў угоддзя неабходна распрацаваць шматгадовы план кіравання ТВП.

Источники информации:

Асабістыя паведамленні: Дамброўскі В.Ч., Фянчук В.А., Багдановіч І., Дмітренок М.

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Бурко Л.Д., Власаў Б.П., Вынаеў Г.У., Дамброўскі В.Ч.)

Mongin, E. 2008. Great snipe population, habitat management andconservation aspects in Belarus: a review. *In: Economical, social and cultural aspects in biodiversity conservation. Proceedings of the 1st North Vidzeme Biosphere Reserve international scientific conference of 23 November, 2006, Valmiera, Latvia. (eds: Opermanis, O., Whitelaw, G.).* Press of the University of Latvia. Pp.31-38.

Составители : Левы С.В.

---

* *Использование размещенной здесь неопубликованной информации для научных публикаций без письменного соглашения ее авторов запрещено. В случае использования части контента или страницы целиком на других интернет-ресурсах, обязательна ссылка на авторов и сайт iba.ptushki.org*